# АБ ГЕНЭЗІСЕ СТАТУТНАГА ПРАВА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

**Т. У. Іванова**
*старшы выкладчык кафедры эканомікі і права*
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь*

У артыкуле аналізуецца роля Статутаў ВКЛ для беларускага права, ўплыў судовай практыкі на змест Статутаў. Адзначаецца, што ў XVI стагоддзі мела месца наступная класіфікацыя фармальных крыніц права: асноўныя (дактрыны, мясцовыя законы) і дапаможныя (або субсідыярныя) у выглядзе іншых сістэм права, а таксама звычаю і судовай практыкі. Статуты ВКЛ аказалі значны ўплыў на заканадаўчую і судовую практыку як ВКЛ, так і суседніх дзяржаў, асабліва Усходняй Прусіі і Лівоніі.

В статье анализируется роль Статутов ВКЛ для белорусского права, влияние судебной практики на содержание Статутов ВКЛ. Отмечается, что в XVI веке имела место следующая класификация формальных источников права: основные (доктрина, местные законы) и вспомогательные (или субсидиарные) в виде иных систем права, а также обычая и судебной практики. Статуты ВКЛ оказали значительное влияние на законодательную и судебную практику как ВКЛ, так и соседних государств, особенно Восточной Пруcии и Ливонии.

The role of the Statutes of the Grand Dutchy of Lithuania for Belarusian Law and the impact of judicial practice on the contents of the Statutes is analyzed in the article. The author notices that the classification of formal legal sources on basic (doctrine, local laws) and additional (subsidiary) as other legal systems, customs, judicial practice takes place in XVI century. Statutes of the Grand Dutchy of Lithuania influenced greatly the legal and judicial practice of both the Grand Dutchy of Lithuania and neighboring states, especially Eastern Prussia and Livonia.

Развіцце права Вялікага княства Літоўскага прайшло некалькі этапаў. Прававая сістэма ВКЛ сфарміравалася на падставе мясцовага звычаёвага права, прававых актаў дзяржаўных і судовых органаў, судовай практыкі. У ВКЛ з 2-й паловы XIII стагоддзя, побач са звычаёвым правам, утвараецца і пісьмовае права, зафіксаванае ў дакументах-граматах (прывілеях) [4; 6]. Для першага этапа (XIV – пачатак XVI стагоддзя) характэрна прыняцце асобных нарматыўных прававых актаў рознага зместу і сферы дзейнасці (граматы вялікага князя Ягайлы 1387 года, Судзебнік Казіміра 1468 года і інш.). Другі этап звязаны з сістэматызацыяй заканадаўства і прыняццем на працягу XVI стагоддзя трох Статутаў – сістэматызаваных зводаў законаў дзяржавы [3; 4; 5; 6; 12].

У XVI стагоддзі развіццё права на Беларусі набывае столь значны характар, што фарміруецца ўласны масіў заканадаўства ў выглядзе

Статутаў 1529, 1566, 1588 гадоў, прынязце якіх стала вяршыняй прававой думкі і свядомасці беларускага народа ў большай меры, а таксама іншых народаў Вялікага княства Літоўскага (далей – ВКЛ) [3; 10; 11].

Аналіз генезісу статутнага права ВКЛ патрабуе выкарыстання інструментальнага падыходу ў спалучэнні з суб'ектным падыходам, заснаванымі на вывучэнні прававой рэчаіснасці праз патрэбы суб'екта (князя, рады, сойма), які выкарыстоўвае права ў якасці інструмента для дасягнення ўласных мэтаў. Мяркуецца, што Статутнае права ВКЛ стала інструментам сістэмнага прававога рэгулявання, адпавядала інтарэсам пэўных суб'ектаў права па забеспячэнні аднастайнасці судовай практыкі, скарачэнні аб'ема канцылярскай працы і прававых дакументаў [9].

У перыяд цэнтралізацыі дзяржавы заканамерна адбываецца працэс уніфікацыі права, у ходзе якога не толькі перапрацоўваецца звычаёвае права, але актыўна абагульняецца ўласная судова-адміністрацыйная практыка, а таксама вывучаецца еўрапейскі прававы вопыт. У ВКЛ добра былі вядомы ўсе накірункі развіцця прававой навукі ўсёй Еўропы. Многія дзяржаўныя дзеячы і навукоўцы праходзілі навучанне ў еўрапейскіх універсітэтах, што стварала тэарэтычныя перадумовы для ажыццяўлення сістэматызацыі заканадаўства. Прынцыпы і агульныя тэндэнцыі фарміравання новай прававой сістэмы праходзілі ў рэчышчы агульнаеўрапейскага прававога працэсу. Гэтаму садзейнічала агульнасць еўрапейскай філасофскай і палітыка-прававой думкі, агульнасць рэлігійнай, палітычнай і юрыдычнай мовы, якою была латынь, а таксама пэўная аднастайнасць у падрыхтоўцы кваліфікаваных юрыдычных кадраў праз заходнееўрапейскія ўніверсітэты. Аднак, нягледзячы на ўсе прадпасылкі, перайсці да сістэматызаванага, агульнага для ўсёй дзяржавы заканадаўства было досыць складаным для любой сярэдневечнай дзяржавы і таму ў прававых сістэмах таго часу выкарыстоўвалася запазычанне. Навука і практыка таго часу ўжывала такі метад, калі ў выпадку прабелаў у мясцовым праве акрамя ўжывання судовай практыкі ўводзіліся замежныя прававыя нормы і інстытуты. Менавіта аб гэтым піша Ю. Бардах: «Кадыфікацыя не абмяжоўвалася спісваннем звычаёвага права, перапрацаванага судовай практыкай, але закладвала яго сістэматызацыю шляхам увядзення новых элементаў, якія адлюстроўвалі інтарэсы «станаў» пануючага класа, або найбольш уплывовых груп насельніцтва. Кадыфікацыя звязана з развіццём навукі права, з павелічэннем яе ўплыву на права і судовую практыку, асабліва гэта тычыцца дасканалай сістэмы рымскага права» [1].

У XVI стагоддзі сістэмны падыход да фарміравання прыватнага заканадаўства забяспечыў утварэнне мноства інстытутаў прыватнага

права. Кадыфікацыя гэтых галін заканадаўства праходзіла пад асаблівай ўвагай навукі і практыкі таго часу. Вучоныя адзначаюць, што ў еўрапейскай юрыспрудэнцыі пачатку XVI стагоддзя мела месца наступная класіфікацыя фармальных крыніц права: асноўныя (дактрыны, мясцовыя законы) і дапаможныя (або субсідыярныя) у выглядзе іншых сістэм права, а таксама звычаю і судовай практыкі. Агульная структура крыніц права была наступнай: дактрына, прынцыпы, закон, судовая практыка, звычай. Дактрына і судовая практыка выкарыстоўваліся як сродак прымянення закону ў канцы XV – пачатку XVI стагоддзяў. Пазней прыярытэт ідэі пазітыўнага права і закона надае яму, як крыніцы права, большае значэнне. Развітае права павінна быць само па сабе сістэмным, таму прабелы ў рэгуляванні павінны запаўняцца субсідыярнымі крыніцамі, якімі з'яўляліся на той час рымская сістэма права (прызнаная навукай як агульная), кананічнае, царкоўнае, магдэбургскае права, а з сярэдзіны XVI стагоддзя тэарэтычна звычаёвае права, разнастайная судовая практыка [5; 7].

Вынікам назапашанага тэарэтычнага і практычнага вопыту ў ВКЛ стала прыняцце першага сістэматызаванага прававога акта. Статут 1529 года змясціў шмат новых прававых нормаў канстытуцыйнага, адміністрацыйнага, грамадзянскага, шлюбна-сямейнага, апякунскага, крымінальнага, працэсуальнага і іншых галін права. У ім назіраецца нарастаючая тэндэнцыя ўсеагульнасці права, а таксама тэндэнцыя перавагі пісанага права. Пры падрыхтоўцы Статута 1529 года заканадаўца не абмяжоўваўся спісваннем звычаёвага права, перапрацаванага судовай практыкай, але ўводзіў новыя прававыя элементы на падставе уласных меркаванняў адносна важнасці і парадку размяшчэння прававога матэрыялу, тым самым закладваючы асновы ўласнай сістэмы права. Аднак трэба адзначыць важную ролю судовай практыкі пры распрацоўцы норм Статута 1529 года [5].

У Статуце 1566 года назіраецца заканадаўчае замацаванне прынцыпу падзелу ўлад. Заканадаўчая ўлада належала сойму, выканаўчая – вялікаму князю і радзе, судовая – новым утвораным у выніку судовай рэформы XVI стагоддзя шляхецкім судам. Аднак поўнага аддзялення судовай улады ў межах феадальнай дзяржавы не магло быць. Толькі ў Статуце 1588 года больш выразна і тэарэтычна ў параўнанні са Статутам 1566 года сфармуляваны палажэнні аб абмежаванні ўлады князя, заканадаўчай функцыі сойма, верхавенстве закона [10].

У аснову Статута 1566 года была пакладзена багатая судовая практыка, заснаваная на Магдэбургскім, звычаёвым і агульналітоўскім

пісаным праве. Прагрэс другога Статута ВКЛ у параўнанні з першым быў відавочны [10].

Статуту 1588 года і судовай практыцы, заснаванай на ім, не ўдалося ў такой меры перасягнуць Статут 1566 года з яго багацейшай судовай практыкай. Статут 1588 года працягнуў традыцыі сваіх папярэднікаў. Звычаёвае права паступова выводзіцца з арсенала сродкаў прававога рэгулявання, тым не менш узбагаціўшы пры гэтым заканадаўства і надаўшы яму свае лепшыя набыткі [11].

Ў 1581 годзе адбылося значнае абмежаванне судовай улады вялікага князя. Быў выдадзены закон аб стварэнні Галоўнага суда (Трыбунала), які складаўся з суддзяў-дэпутатаў, штогод абіраемых на павятовых сойміках (па два ад кожнага павета). Статут 1588 года ўдакладніў палажэнні аб дзейнасці гэтага суда, на які ускладалася задача апеляцыйнага разгляду спраў. Рашэнні Трыбунала былі канчатковымі і абскарджанню не падлягалі.Акрамя таго, суд разглядаў скаргі на незаконныя дзеянні мясцовых службовых асоб і суддзяў мясцовых судоў як першая інстанцыя. Разгляд такіх спраў фарміраваў адпаведную судовую практыку Трыбунала [6; 8; 12].

Значнае развіцце ў Статуце атрымалі нормы крымінальнага права, у якіх знайшлі адлюстраванне ідэі гуманізму. Напрыклад, па Статуту псіхічна хворыя асобы не падлягалі крымінальнаму пакаранню (арт. 4 разд. I). Вызваляліся ад крымінальнай адказнасці асобы, якія не дасягнулі 16 гадоў (арт. 11 разд. XIV) [3].

У Статутах 1566 и 1588 гадоў распрацаваны навуковыя прынцыпы класіфікацыі норм права і прававых інстытутаў, значная колькасць агульных норм, пашырана сфера прававога рэгулявання і шэраг суб’ектаў праваадносін, удасканалена юрыдычная тэхніка і тэрміналогія.

Статуты адлюстравалі найбольш прагрэсіўныя тэндэнцыі ў заканадаўстве ВКЛ XVI стагоддзя. Праца юрыстаў (тэарэтыкаў і практыкаў) ВКЛ была па вартасці ацэнена і выкарыстоўвалася юрыстамі шэрагу еўрапейскіх дзяржаў. Усе тры Статута перакладаліся на еўрапейскія мовы (лацінскую, польскую, рускую, нямецкую і інш.), служылі ўзорам кадыфікацыі. Яны аказалі значны ўплыў на заканадаўчую і судовую практыку як ВКЛ, так і суседніх дзяржаў, асабліва Усходняй Прусіі і Лівоніі. Польскія вучоныя (Ю. Бардах, Т. Астроўскі і інш.) адзначалі, што ў XVII-XVIII стагоддзях у польскіх судах спасылаліся на Статут 1588 года як на дадатковую крыніцу права пры адсутнасці неабходнай нормы ў польскім заканадаўстве [1]. Статут 1588 года выкарыстоўваўся судамі ў Маскоўскай дзяржаве ў якасці адной з крыніц права. Статуты ВКЛ з’яўляюцца памятнікамі права, якія па свайму ўзроўню і значнасці стаяць ў адным шэрагу з найважнейшымі

гістарычнымі законамі Заходняй Еўропы. Прагрэсіўная палітыка-прававая думка і багатая судовая практыка XVI стагоддзя, якія знайшлі адлюстраванне ў палажэннях Статутаў ВКЛ, сведчаць пра высокую прававую культуру беларускага народа, прадстаўнікі якога прымалі ўдзел у стварэнні гэтых знакамітых законаў [3]. Прыярытэт пісанага права, абвяшчэнне адзінства права для ўсяго насельніцтва ВКЛ дазваляюць сцвярджаць, што ў Статутах ВКЛ намячаецца працэс станаўлення агульнадзяржаўнай прававой сістэмы.

Такім чынам, незалежна ад каштоўнасці ідэйнага зместу, карыснасці крыніц і адпаведнасці навакольнай абстаноўцы сэнс існавання любой юрыдычнай сістэмы вымяраецца яе эфектыўнасцю. Для таго каб стаць часткай рэчаіснасці, права мае патрэбу ў эфектыўным ужыванні. Права здольна выканаць сваю галоўную функцыю толькі тады, калі яно эфектыўна ўкараняецца ў практыку. Прымяненне права патрабуе наяўнасці пэўных інструментаў – механізма прававога рэгулявання [2]. Статутнае права ВКЛ стала інструментам сістэмнага прававога рэгулявання, адпавядала інтарэсам пэўных суб'ектаў права па забеспячэнні аднастайнасці судовай практыкі, скарачэнні аб'ема канцылярскай працы і прававых дакументаў, мела прававы механізм па рэалізацыі яго палажэнняў (распрацаваная юрыдычная тэхніка і тэрміналогія, дакладныя нормы, юрыдычная адказнасць, сістэма дзяржаўных органаў), таму з'яўлялася эфектыўным на працягу стагоддзяў.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Бардах Ю. Литовские Статуты – памятники права периода Возрождения // Культурные связі народов Восточной Европы в XVI веке: проблемы взаимоотношения Польши, России, Украины, Белоруссии и Литвы вэпоху Возрождения: сб. ст. / Академия наук СССР, Ин-т славяноведения и балканистики, Ин-т истории СССР; под ред. Б.А. Рыбакова. М.: Наука, 1976. С. 71-93.

2. Бержель Ж.-Л. Общая теория права / Под общ. ред. В.И. Даниленко / Пер. с фр. Г.В. Чуршукова. М.: Издательский дом NOTA BENE, 2000. 576 с.

3. Довнар Т.И. Выдающийся европейский памятник права XVI ст. // Право и демократия : сб. науч. трудов. Вып. 24 (2013). С.15-27.

4. Доўнар Т.І., Арлоўская А.І., Кожар А.В. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб.дапам. Мінск: РІПА, 2018. 268 с.

5. Доўнар Т.І. Крыніцы права Беларусі перыяду Вялікага княства Літоўскага // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Серыя 4. Правазнаўства. 2008. № 1. С. 29-32.

6. Доўнар Т.І. Права Беларусі ў кантэксце гістарычнай эвалюцыі дзяржаўнасці [Электронны рэсурс]. Мінск: БДУ, 2018. 520 с. ISBN 978-985-566-576-6.

7. Доўнар Т.І. Праватворчасць у Беларусі ў старажытны перыяд // Юридическая наука и практика: наследие, состояние и перспективы развития: сб.

науч. ст.: в 2 ч. Ч.1 / ГрГУ им. Я.Купалы; редкол.: С.Е. Чебуранова (гл.ред.) [и др.]. Гродно: ГрГУ. 2018. С. 19-24.

8. Доўнар Т.І. Судова-працэсуальная дзейнасць у старажытных беларускіх дзяржавах // Уголовная юстиция в свете интеграции правовых систем и интернационализации криминальных угроз: сб. науч. тр., приуроч. К 90-летию д-ра юр.наук, проф. И.И. Мартинович / БГУ; редколл.: А.А. Данилевич (отв.ред.), О.В. Петрова, В.И. Самарин. Минск: Изд. Центр БГУ. 2017. С. 22-25.

9. Калинин С.А. Інструментальне розуміння права в контексті суб'єктного підходу: щодо проблеми взаємодії методологічних стратегій // Філософія права і загальна теорія права. № 1. 2/2014. С. 239-252.

10. Статут Вялікага княтсва Літоўскага 1566 года / Т.І. Доўнар, У.М. Сатолін, Я.А. Юхо; рэдкал.: Т.І. Доўнар [і інш.]. Мінск: Тэсей, 2003. 352 с.

11. Статут Вялікага княтсва Літоўскага 1588 г.: тэксты, давед. камент. / Т.І. Доўнар; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал.рэд.), калект.аўт. : Л.В. Аржаева, А.М. Булыка, Г.Я. Галенчанка [і інш.] // Беларус. Сав. Энцыкл. Минск: БелСЭ. 1989. 573 с.

12. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Вучэбн. дапам. Мінск: РІВШ БДУ, 2000. 352 с.